**Т. П. Дзіндзікава,**
настаўнік гімназія №4 г. Магілёва

## Словазлучэнне. Здабываем веды самастойна

**Тэма.** Словазлучэнне
**Задачы:** сістэматызаваць, дапоўніць і замацаваць веды вучняў пра размежаванне словазлучэнняў і спалучэнняў слоў, пра тыпы словазлучэнняў паводле выражэння галоўнага слова (дзеяслоўныя, іменныя, прыслоўныя), у адпаведнасці з граматычным значэннем (азначальныя, акалічнасныя, аб'ектныя), у залежнасці ад характару сувязі паміж кампанентамі (сінтаксічна свабодныя і несвабодныя), паводле структуры (простыя і складаныя); удасканальваць навыкі вызначэння віду сінтаксічнай сувязі слоў у словазлучэннях (дапасаванне, кіраванне, прымыканне); развіваць здольнасць правільнага выкарыстання словазлучэнняў у маўленні, развіваць крытычнасць, самастойнасць мыслення, звязную мову, навыкі работы з заданнямі тэставай формы; выхоўваць паважлівае стаўленне да беларускай мовы.
**Тып урока:** камбінаваны (можна зрабіць мультымедыйную прэзентацыю)
**Тэхналогія:** праблемнае навучанне.
**Эпіграф:**

> Толькі тады веды робяцца нашым сталым
> набыткам, калі мы прыходзім да іх,
> здабываем іх самі.
> Я. Колас

**Абсталяванне:** Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання/ Г.М.Валочка (і інш.). –Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2009; лісты з надрукаваным матэрыялам –дадаткі № 1, 2 , памяткі № 1, 2, 3.

### Ход урока

**I. Арганізацыйны момант.**
**II. Матывацыйны этап урока.**
***1. Выберыце правільны варыянт адказу на наступнае пытанне: ”Мэта вывучэння той ці іншай тэмы па беларускай мове?”***
а) паўтарыць, сістэматызаваць, замацаваць і паглыбіць веды па канкрэтнай тэме;
б) пазнаёміцца з пэўным новым паняццем, тэмай.

***2. Успомнім:***
- ✓ Што такое словазлучэнне?
- ✓ Ці былі  цяжкасці пры выкананні дамашняга задання па дадзенай тэме ? (Практыкаванне апераджальнага характару на картках:

запісаць словазлучэнні па-беларуску. Лічбы замяніць словамі, вызначыць спосаб падпарадкавальнай сувязі)

- ✓ Ці дастаткова тэарэтычных звестак у школьным падручніку?

***3. Выкананне тэставых заданняў па тэме*** "Словазлучэнне". Мэта: праверыць узровень засваення матэрыялу па дадзенай тэме. Гэта заданне можа выконвацца самастойна кожным вучнем з паслядоўнай праверкай па ключы або калектыўнай з паслядоўным тлумачэннем кожнага задання. **(Дадатак №1)**

**Прамежкавая рэфлексія:**

1) з якімі цяжкасцямі сутыкнуліся?

2) што трэба зрабіць, каб пазбегнуць гэтых цяжкасцей? *(Вучні аналізуюць свой узровень ведаў па тэме і сваю дзейнасць на першым этапе ўрока)*

**III. Падрыхтоўка да актыўнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, актуалізацыя набытых ведаў, сфарміраваных уменняў і навыкаў.**

**1. Зварот да эпіграфа**

**2. Вызначэнне пазнавальнай задачы, пазнавальны пошук.**

| **Настаўнік** | **Вучні** |
|---|---|
| **выкарыстоўвае дыялог, які пабуджае да вырашэння праблемы** | **фармулююць тэму, вывад па тэме** |
| ***Знайдзіце і выпішыце словазлучэнні*** *(можна дыктаваць, можа быць запіс на дошцы, можна парпанаваць ліст з надрукаваным практыкаваннем)*: ***няхай растуць, шырокае поле, пяцьсот сорак другі, працаваць старанна, хадзіць па вуліцы, для таго каб, найбольш прыгожа, луг квяцісты, самы цёплы, поруч з домам, парассыпала пялёсткі, ідзе дождж, давайце друкаваць, разбегліся наўкол, мароз і вецер, пісьмо брата.*** | ***Шырокае поле, працаваць старанна, хадзіць па вуліцы, парассыпала пялёсткі, разбегліся наўкол, мароз і вецер, пісьмо брата.*** |
| ✓ ***Чым кіраваліся пры вызначэнні словазлучэнняў?***<br>✓ ***Ці ўсе згодны?( Пабуджэнне да праверкі)***<br>✓ ***Сфармулюйце тэму. (Вывад)*** | **1.** ***Словазлучэнне складаецца з двух ці больш самастойных слоў, якія звязаны падпарадкавальнай сувяззю.***<br>**2.** ***Словазлучэнне мае галоўнае і залежнае словы (кампаненты).***<br>**3.** ***Пры дапасаванні і кіраванні паміж кампанентамі словазлучэння ёсць*** |

| | |
|---|---|
| | ***граматычная сувязь (залежнае слова стаіць у пэўнай форме пры галоўным: пры дапасаванні – у той жа самай форме роду, ліку і склону, што і галоўнае; пры кіраванні – у пэўным ускосным склоне).*** |
| ✓ ***Чаму астатнія прыклады не з'яўляюцца словазлучэннямі?*** | ***Не з'яўляюцца словазлучэннямі:***<br>1) *няхай растуць, давайце друкаваць* – ***формы загаднага і ўмоўнага ладоў дзеяслова;***<br>2) *пяцьсот сорак другі* – ***састаўны лічэбнік;***<br>3) *для таго каб* – ***састаўны злучнік;***<br>4) *найбольш прыгожа, самы цёплы* – ***формы параўнання прыметніка і прыслоўя;***<br>5) *луг квяцісты, ідзе дождж* – ***спалучэнне дзейніка і выказніка;***<br>6) *поруч з домам* – ***самастойнае слова са службовым;***<br>7) *мароз і вецер* – ***два самастойныя словы , звязаныя злучальнай сувяззю;*** |
| ✓ ***А якія яшчэ спалучэнні слоў не з'яўляюцца словазлучэннямі?***<br>*(Вучні самі павінны назваць, бо паўтаралі, калі рыхтаваліся да ўрока. У слабым класе трэба прапанаваць памяткі на гэты пункт правіла).* | 8) ***ускладненыя простыя дзеяслоўныя выказнікі*** – *пайду пагляджу, схадзі папытайся;*<br>9) ***формы будучага часу дзеяслова*** – *не буду чытаць, будзем пісаць;*<br>10) ***спалучэнне з адасобленымі членамі сказа*** – *свята, поўнае ўражанняў; ісці, абмінаючы глухія мясціны;*<br>11) ***фразеалагізмы (яны не з'яўляюцца прадметам сінтаксісу і вывучаюцца ў фразеалогіі)*** – *сядзець склаўшы рукі, лебядзіная песня, ахілесава пята, зорка першай велічыні.* |

**3. Як класіфікуюць словазлучэнні?** (Паводле выражэння галоўнага слова, сэнсавых адносін, характару сувязі слоў (кампанентаў) і структуры).

**Звярніцеся да матэрыялу памятак № 1, № 2 ”Класіфікацыя словазлучэнняў”, “ Віды сінтаксічнай сувязі слоў у словазлучэннях”:**

а) прачытаць і зрабіць вывады для сябе (памяткі павінны быць у кожнага вучня на парце, а потым і ў канспекце);

б) што можаце дапоўніць да сказанага пра словазлучэнне?

- ✓ У залежнасці ад чаго падзяляюць словазлучэнні на дзеяслоўныя, іменныя, прыслоўныя?

- ✓ Як вызначыць сінтаксічна свабодныя і сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні?
- ✓ Чым адрозніваюцца простыя і складаныя словазлучэнні?
- ✓ Як выяўляецца тып сінтаксічных адносін у словазлучэнні?

**Фізкультмінутк**а.

**IV. Этап замацавання набытых ведаў, уменняў і навыкаў.**

***1. Выберыце з тэксту*** *(тэкст запісаны на дошцы або на асобных лістках, якія знаходзяцца на парце кожнага вучня)* ***і запішыце словазлучэнні, што адпавядаюць наступнай характарыстыцы:***

**а)** словазлучэнне простае, свабоднае, дзеяслоўнае, акалічнасныя адносіны, прымыканне;

**б)** словазлучэнне простае, свабоднае, іменнае, азначальныя адносіны, дапасаванне;

**в)** словазлучэнне простае, свабоднае, дзеяслоўнае, акалічнасныя адносіны, кіраванне;

**г)** словазлучэнне простае, свабоднае, дзеяслоўнае, аб’ектныя адносіны, кіраванне.

Дождж перастаў нечакана. Разарваная хмара ссоўвалася за дальні лес, і неўзабаве сонца зноў заліло поле. Яно цяпер дымілася лёгкім туманам, і пасвятлелая зяляніна ажывала, выпрасталася і прагна ўбірала вільгаць. Усё змянілася ўвачавідкі: рунь пагусцела, заблішчалі краскі на ўзмежку, а дальні ўзгорак нібы хто пафарбаваў (паводле Т. Хадкевіча).

**Адказы: а)** перастаў нечакана, заліло неўзабаве, заліло зноў, дымілася цяпер, убірала прагна, змянілася ўвачавідкі; **б)** разарваная хмара, за дальні лес, лёгкім туманам, пасвятлелая зяляніна, дальні ўзгорак; **в)** ссоўвалася за лес, дымілася туманам, заблішчалі на ўзмежку; **г)** заліло поле, убірала вільгаць.

2. ***Звернем увагу на памятку № 3 “Граматычныя асаблівасці словазлучэнняў у беларускай мове”.*** (Калектыўная праца па дадзеным матэрыяле: пераклад словазлучэнняў з асаблівасцямі кіравання. Вучні працуюць на гэтых лістах).
3. ***Пытанні для самаправеркі:***
   - ✓ Адзінкай якога раздзела мовазнаўства з’яўляецца словазлучэнне?
   - ✓ Што такое словазлучэнне?
   - ✓ Ці любое спалучэнне слоў з’яўляецца словазлучэннем?
   - ✓ Пералічыце віды сінтаксічнай сувязі слоў у словазлучэнні?
   - ✓ Паводле чаго адбываецца класіфікацыя словазлучэнняў?

**V. Этап праверкі ведаў.** Пошукавая самастойная дзейнасць: заданні тэставай формы **(<u>Дадатак 2)</u>.** Магчымы варыянт: або тэматычны кантроль

з праверкай настаўнікам задання ў кожнага вучня, або самаправерка па ключы і самаацэнка вучнямі сваёй дзейнасці.

**VI. Падвядзенне вынікаў урока.**

**VII. Рэфлексія.** Зыходзячы з мэт урока, акрэслім:

а) хто толькі атрымаў сёння тэарэтычную інфармацыю па дадзенай тэме – валодае ведамі;

б) хто можа веды прымяніць на практыцы – валодае ўменнямі;

в) хто можа смела адзначыць, што **валодае навыкамі** – веды, уменні, можа прымяніць у любой сітуацыі (даведзены да аўтаматызму).

**Вывад:** што неабходна зрабіць, каб удасканаліць свае веды па дадзенай тэме?

**Заўвага:** на ўдасканальванне ведаў, выпрацоўку ўменняў і навыкаў будзе адведзены час на дадатковых уроках (факультатыўных і стымулюючых занятках).

**VIII. Дамашняе заданне.** Вывучыць матэрыял параграфа №32 у падручніку і канспект (Памяткі № 1,2,3), практ. 235 ( падабраць і запісаць да прыведзеных словазлучэнняў сінанімічныя). **Заўвага:** астатнія практыкаванні ў падручніку па гэтай тэме можна паступова разглядаць на наступных уроках для паўтарэння дадзенай тэмы.

## Дадатак №1

### Тэст па тэме “Словазлучэнне”

**1. Адзначце сцвярджэні, якія адпавядаюць паняццю “словазлучэнне”:**

а) два ці болей слоў, якія стаяць побач;

б) два ці болей слоў, якія адносяцца да адной часціны мовы;

в) два ці болей слоў, звязаных граматычна;

г) два ці болей слоў, звязаных па сэнсе і граматычна.

**2. Што з пералічанага ніжэй не адносіцца да словазлучэнняў?**

а) спалучэнне дзейніка і выказніка;

б) спалучэнне аднародных членаў сказа;

в) склонавая форма назоўніка і прыназоўніка;

г) спалучэнне двух слоў, звязаных па сэнсе і граматычна;

д) складаная форма ступені параўнання прыметніка;

е) складаная форма ступені параўнання прыслоўя;

**3. Завяршыце пералік часцін мовы, якія могуць ужывацца ў ролі залежных слоў пры прымыканні:** *дзеяслоў неазначальнай формы,…*

**4. Падкрэсліце словазлучэнні:**

| | |
|---|---|
| а) добрая вестка; | ё) дабро і зло; |
| б) каля дуба; | ж) паўтараць бясконца; |
| в) кроплі дажджу; | з) няхай прыедзе; |
| г) нізка над лесам; | і) для таго каб; |
| д) будзем думаць; | к) на працягу дня; |
| е) сорак пяць; | л) трава скошана. |

**5. Адзначце словазлучэнні, якія адпавядаюць нормам беларускай мовы:**

| | |
|---|---|
| а) выбачайце мне; | д) два летніх дні; |
| б) дзякаваць брата; | е) за пяць кіламетраў ад дома; |

в) дзякаваць брату; ё) два летнія дні;
г) у пяці кіламетрах ад дома; ж) выбачайце мяне.

**6. Закончыце азначэнні:**
а) дапасаванне – гэта спосаб падпарадкавальнай сувязі, пры якім….;
б) кіраванне -- гэта спосаб падпарадкавальнай сувязі, пры якім….;
в) прымыкане --- гэта спосаб падпарадкавальнай сувязі, пры якім….;

**7. Якія словазлучэнні адпавядаюць схеме: *залежнае слова+ галоўнае слова*?**
а) большасць вучняў; д) крыху павесялець;
б) велічынёю з яблык; е) радавацца вясне;
в) сестрына кніга; ё) рана пасаджаны.
г) дарога за лесам;

**8. Знайдзіце памылкі ва ўказанні спосабу сувязі слоў у словазлучэннях:**
а) крыўда на сябра (дапасаванне);
б) пакрыўдзіць сябра (кіраванне);
в) напісаць выразна (прымыканне);
г) напісаць выраз (кіраванне);
д) пакрыўджаны сябар (дапасаванне);
е) выразнае напісанне (прымыканне).

**9. Адзначце словазлучэнні з сувяззю кіравання:**
а) верыць у лепшае; д) працаваць не стамляючыся;
б) вучыцца лепш; е) уверх па цячэнні;
в) вырабіць з бярозы; ё) зроблены вучнямі.
г) менш за месяц;

**10. Запішыце з дадзенымі словамі <u>па тры словазлучэнні</u> з рознымі спосабамі сувязі, укажыце від сувязі: *боршч, стомлены, вільготны.***

# Памятка №1
# Класіфікацыя словазлучэнняў

1. **<u>Паводле выражэння галоўнага слова</u>:**
   - **дзеяслоўныя** *( смяяцца гучна, прапанаваць вывучыць, сустрэцца ў метро, выхаваны з маленства, адрозніваючыся значэннем)***;**
   - **іменныя : а) назоўнікавыя** *(уручэнне ўзнагарод, паварот улева, жаданне зразумець, школьная парта),* **б) прыметнікавыя** *( поўны радасці, гатовы да змагання, заўсёды маўклівы),* **в) займеннікавыя** *( нехта з нас, кожны восьмы, хтосьці з суседзяў),* **г) лічэбнікавыя** *( другі ад мяне, трэці злева)***;**
   - **прыслоўныя** *( занадта небяспечна, сумна ад болю, вельмі ўдала).*
2. **<u>У адпаведнасці з граматычным значэннем (сэнсавымі адносінамі, якія выражаюцца паміж словамі) :</u>**
   - **азначальныя :** *настольнік (які?) у клетку, дом (які?) насупраць, кусты (якія?) агрэсту, блакітная (якая?) сукенка;*
   - **акалічнасныя :** *жыць (дзе?) недалёка, адкласці (на які час?) на паслязаўтра;*
   - **аб'ектныя :** *сустракаць (каго?) сястру, выпіць (чаго?) квасу, ганарыцца (чым?) дасягненнямі.*
3. **<u>У залежнасці ад характару сувязі паміж кампанентамі:</u>**

- **сінтаксічна свабодныя , дзе кожнае слова захоўвае сваё лексічнае значэнне і выконвае ў сказе пэўную сінтаксічную функцыю:** *слухаць вучня, клапатлівыя бацькі, бегчы хутка;*
- **несвабодныя словазлучэнні, якія з'яўляюцца непадзельнымі, яны ўтвараюць сінтаксічнае адзінства і ў структуры сказа выступаюць як адзін член сказа :**

*мужчына <u>сярэдняга росту (азначэнне),</u> <u>дзве бярозы</u> растуць (дзейнік), хлопцы <u>надумаліся пайсці (выказнік).</u>*

***Сінтаксічна непадзельнымі з'яўляюцца: 1) састаўныя ўласныя імёны** (Мінскі трактарны завод, Старыя Дарогі, Вялікая Мядзведзіца)**; 2) састаўныя тэрміны – навуковыя паняцці з розных галін навукі і тэхнікі** ( галосны гук, свісцячы зычны, ядомыя грыбы, суглiністая глеба)**; 3) перыфразы** (чорнае золата—нафта, другі хлеб –бульба, лясная вяшчуня –зязюля, цар пушчы –зубр, карычневая чума –фашызм)**; 4) спалучэнні тыпу** падарожжа (якое?) **у адзін дзень** (аднадзённае),дзеці (якія?) **школьнага ўзросту**; **5) колькасна-іменныя спалучэнні** (тры алоўкі, абедзве сяброўкі, сем дзён); **6) састаўныя выказнікі** (пачаць размаўляць, думаць будаваць, быць чулым, стаць майстрам).*

4. **<u>Паводле структуры:</u>**

- **<u>простыя</u>, якія складаюцца з двух самастойных кампанентаў** *(восеньскі ранак, прыйшоў раніцай, чытаць выразна, праверка заданняў);*
- **<u>складаныя</u> маюць у сваім саставе некалькі самастойных слоў** *( прыгожая летняя кветка, працаваць на адноўленым заводзе, адрамантаваны школьны будынак, кватэра нумар трыццаць, даць абяцанне аказаць падтрымку)***.**

**<u>Памятай!</u> Простым з'яўляецца словазлучэнне, калі адзін з кампанентаў выражаны:**

*1)* **сінтаксічна непадзельным словазлучэннем:** *курсы (якія?) **павышэння кваліфікацыі, два кілаграмы** (колькі?) цукру;*
*2)* **фразеалагізмам:** *выразны (які?) **адамаў яблык,** мая (чыя?) **лебядзіная песня, быць на віду** (дзе?) у калектыве;*
*3)* **складанай формай:** ***буду чытаць** (што?) верш**, самы дастойны** (які?) вучань, сказаць (як?) **найбольш выразна;***
4) **састаўным уласным іменем:** *удалы (які?) **Новы год,** родны (які?) **Новы Двор,** вядомы (які?) **Мінскі аўтамабільны завод.***

# Памятка №2

## Віды сінтаксічнай сувязі слоў у словазлучэнні

(спосабы сувязі слоў у словазлучэнні)

| **Спосаб сувязі** | **Асаблівасць** | **Спосаб выражэння залежнага слова** | **Прыклады** |
|---|---|---|---|
| **Дапасаванне** | Залежнае слова дапасуецца да галоўнага ў ліку, родзе і склоне | прыметнік | *сяброўскія адносіны, стары дом, гаючы бальзам, высокі хлопец* |
| | | дзеепрыметнік | *аснежаныя галіны, падкрэсленыя словы, пажоўклыя кветкі* |
| | | парадкавы лічэбнік; колькасныя *адзін, два, абодва, тры, чатыры ва ўсіх склонах; лічэбнікі ад 5 да 20, 30, зборныя—ва ўсіх склонах, акрамя Н. і В склонаў* | *восьмы паверх, пятнаццаты год, сорак трэцяя старонка;двума дыскамі, адзін салдат;пяці машын, сямю вучнямі, траім жанчынам* |
| | | займеннікі | *мой сын, гэты год, кожны чалавек, усякі выпадак* |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | назоўнік (у форме назоўнага склону), які выступае ў ролі прыдатка | *кветкі-гускі, вецер-свавольнік, горад Мінск* |
| **Кіраванне** | Галоўнае слова патрабуе, каб залежнае стаяла ў пэўным ускосным склоне. **Заўвага:** ***лічэбнікі ад 5 да 20, 30 у форме Н. і В. склонаў кіруюць назоўнікамі і патрабуюць ад іх пэўнай формы ўскоснага склону*** | назоўнік (у тым ліку і субстантываваны) ці іншая часціна мовы, ужытая ў значэнні назоўніка ( у тым ліку і нязменныя словы) | *з’ехаць з гары, павіншаваць сябра, падплыць да берага, сказаць незнаёмаму, аддаць сваім, дагнаць першага, аддаць лепшаму, слухаем радыё, апрануты ў паліто, убачыў кенгуру, слухаць папуры;пяць тэлефонаў, трыццаць восем флэш-картаў* |
| **Прымыканне** | Залежнае слова (нязменнае) звязваецца з галоўным толькі паводле сэнсу | прыслоўе | *пішам старанна, зусім блізка, быў нядаўна, дом насупраць* |
| | | дзеепрыслоўе | *чытаць лежачы, ісці задумаўшыся* |
| | | інфінітыў | *жаданне выспацца, імкненне перамагчы* |
| | | запазычанае нязменнае слова | *рукаў рэглан, колеру хакі, спадніца міні* |

# Памятка №3 (даведка)

## Граматычныя асаблівасці словазлучэнняў у беларускай мове (асаблівасці кіравання ў беларускай мове)

| **Па-беларуску** | **Па-руску** |
|---|---|

| | |
|---|---|
| **1.**Смяяцца, жартаваць, кпіць, цешыцца **з** суседзяў (Р.скл)<br>**2.**Бегчы, ісці, ляцець, накіраваць, адправіць **па** (значэнне мэты) малако (В.скл.)<br>**Але: у** грыбы, **у** ягады**, у** арэхі. Пайсці **за** (значэнне кірунку дзеяння, напрамку) сястрой (услед) (Т. скл.) | 1. Смеяться, шутить, насмехаться **над** соседями (Т.п.)<br>2. Бежать, идти, лететь, направлять, отправить **за** молоком, за ягодами…, пойти **за** сестрой (Т.п.) |
| **3.**Дзякаваць, выбачаць, дараваць мне, маці, бацьку (Д.скл.) | 3.Благодарить, извинять, прощать меня, мать, отца (В.п.) |
| **4.**Адсутнічаць **па** суботах, прыязджаць **па** нядзелях, ісці **па** палях (М.скл.) | 4. Отсутствовать **по** субботам, приезжать **по** воскресеньям, идти **по** полям (Д.п.) |
| **5.**Думаць, клапаціцца, марыць, непакоіцца **пра** дзяцей, **пра** родных(В. скл.) | 5. Думать, хлопотать, мечтать, беспокоиться **о (об)** детях, **о** родных (Пр.п.) |
| **6.**Ажаніцца, жаніцца **з** Марынаю, Вольгай Іванаўнай (Т. скл.) | 6. Жениться на Марине, Ольге Ивановне (П.п.) |
| **7.**Пісаць, дасылаць, адпраўляць **на** адрас (В.скл.) | 7. Писать, отсылать, отправлять **по** адресу (В.п.) |
| **8.** Вызначаць **на** смак, **на** густ, **на** водар (В. скл.) | 8. Определять **по** вкусу, **по** запаху (П.п.) |
| **9.** Радавацца **з** нагоды нараджэння (Р.скл.) | 9. Радоваться дню рождения (Д.п.) |
| **10.** Хварэць **на** ангіну, хворы **на** сухоты (В.скл.) | 10. Болеть ангиной, больной туберкулёзом (Т.п.) |
| **11.** Дом **за** дваццаць кіламетраў ад чыгункі, прыпынак **за** трыста метраў ад метро (В. скл.) | 11. Дом **в** двадцати километрах от железной дороги, остановка **в** трёхстах метрах от метро (Р.п.) |
| **12.** Знаходзіцца **ў** суседстве (М. скл.) | 12. Находиться **по** соседству (П.п.) |
| **13.** Падобны **да** маці, **да** брата (Р. скл.) | 13. Похожий **на** мать, **на** брата (В.п.) |
| **14.** Чытаць самому сабе (Д. скл.) | 14. Читать **про** себя (В.п.) |
| **15.** Пах ідзе **з** ветрам (Т. скл.) | 15. Запах идёт **по** ветру (П.п.) |
| **16.** Не зрабіць **праз** ляноту (В. скл.) | 16. Не сделать **из-за** лени (Р.п.) |
| **17.** Тлумачэнне памылак (Р. скл.) | 17. Работа **над** ошибками (Т.п.) |
| **18.** Праспяваць **на** поўны голас (В. скл.) | 18. Пропеть **во** весь голос (В.п.) |
| **19.** Загадчык аддзела (Р. скл.) | 19. Заведующий отделом (Т.п.) |
| **20.** Догляд хворага (Р. скл.) | 20. Уход **за** больным (Т.п.) |
| **21.** Сказаць, зрабіць **пад** сакрэтам | 21. Сказать, сделать **по** секрету (П.п.)<br>22. Тосковать **о** сыне, тоска **о** родном |

| | |
|---|---|
| (Т. скл.)<br>**22.** Сумаваць **па** (са значэннем пачуцця) сыне, туга **па** родным краі, жалоба **па** ахвярах трагедыі ( М. скл.) | крае, скорбь **о** жертвах трагедии (П.п.) |
| **23.** Хадзіць **па** (са значэннем дзеяння) шляхах, вандроўка **па** ваенных мясцінах (М. скл.) | 23. Ходить **по** дорогам, путешествие **по** военным местам (П.п.) |
| **24. Дзеля** шчасця дзяцей (Р.скл.) | 24. **Ради** счастья детей (Р.п.) |
| **25.** Яны дружнейшыя **за** нас (В.скл.) | 25. Они дружнее нас (Р.п.) |
| **26.** Дом **на** пяць паверхаў (В. скл.) | 26. Дом **в** пять этажей |
| **27.** Стаяць **каля** дошкі (Р.скл.) | 27. Стоять **у** доски (Р.п.) |
| **28.** Два разы **на** тыдзень (В. скл.) | 28. Два раза **в** неделю (В.п.) |
| **29.** Усё **на** карысць Бацькаўшчыны ( В.скл.) | 29. Всё **в** пользу Отчизны ( В.п.) |
| **30. У** кірунку **да** ракі | 30. **По** направлению **к** реке |
| **31.** Смуткаваць **з прычыны** (Р. скл.) | 31. Грустить **по** причине (П.п.) |
| **32.** Не **да** месца, не **да** твару (Р.скл.) | 32. Не **к** месту, не **к** лицу (Д.п.) |
| **33.** Спатыкнуцца **на** пень (В. скл.) | 33. Споткнуться **о** пень (В.п.) |
| **34.** Перапрашаць сяброўку (В. скл.) | 34. Извиняться перед подругой (Т.п.) |
| **35.** Сумёты **па** мядзведзю (Д. скл.) | 35. Сугробы **с** медведя (В.п.) |
| **36.** Пазычыла сякеры, запалак, нітак (Р. скл.) | 36. Одолжила топор, спички, нитки (В.п.) |
| **37.** Апекаваць дяцей (Р.скл.) | 37. Опекунство **над** детьми (Т.п.) |
| **38.** Сустрэліся **а** пятай гадзіне (М.скл.) | 38. Встретились **в** пять часов (Р.п.) |

# Дадатак № 2

## Тэст па тэме “Словазлучэнне”

Варыянт 1

1. **Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, якія не з’яўляюцца словазлучэннямі:**
   1) будзем чакаць;
   2) высокае дрэва;
   3) самы прыгожы;
   4) бегчы праз лес;
   5) тым часам як.
2. **Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца галоўнымі:**

1) пахне *кропам;*
2) пералётныя *птушкі*;
3) *іскрыліся* на галінах;
4) цягнуліся *ўверх*;
5) *велічна* трымалася.

**3. Адзначце несвабодныя словазлучэнні:**

1) ісці напрасткі;
2) клапаціцца пра бацькоў;
3) даць драпака;
4) кату па пяту;
5) варона загуменная.

**4. Адзначце простыя словазлучэнні:**

1) намаляваць белыя рамонкі;
2) зрабіць на скорую руку;
3) вучань дзясятага класа;
4) прыехаць у Вялікае Мажэйкава;
5) кучаравіліся абапал дарог.

**5. Адзначце словазлучэнні з аб'ектнымі адносінамі паміж словамі:**

1) бераг ракі;
2) накапаць бульбы;
3) выпіць малака;
4) пазычыць хлеба;
5) убачыць заўтра.

**6. Адзначце іменныя словазлучэнні:**

1) дзявяты клас;
2) прыселі адпачыць;
3) даражэйшыя за ўсіх;
4) рана вясною;
5) хтосьці з нас.

**7. Адзначце прыслоўныя словазлучэнні:**

1) жнівеньскі дзень;
2) распраўляць крылы;
3) дзесьці за горадам;
4) запомніў назаўсёды;
5) нечакана для нас.

**8. Адзначце словазлучэнні, у якіх сувязь паміж словамі – кіраванне:**

1) моцны лівень;
2) пахла канюшынай;
3) водар медуніцы;
4) змывае са сцежкі;
5) хутка насоўваліся.

**9. Адзначце словазлучэнні, у якіх сувязь паміж словамі – прымыканне:**

1) знікла раптоўна;
2) незлічоныя раўчукі;
3) сустрэцца зімою;
4) хадзілі навокал;
5) закінуты здаўна.

**10. Адзначце словазлучэнні з граматычнымі памылкамі:** 1) выбачайце Івана; 2) тужу па вясне; 3) дзівіцца над малым; 4) тры дня; 5) падрыхтавацца да паступлення.

# Дадатак №2
# Тэст па тэме "Словазлучэнне"
## Варыянт 2

**1. Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, якія не з'яўляюцца словазлучэннямі:**

1) бяроза жоўтая;
2) згодна з праграмай;
3) чытаць выразна;
4) пяцьсот восемдзесят сем;
5) ускраіна лесу.

**2. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца галоўнымі:**

1) спазналі *шчасце*;
2) *струменіць* з-пад карэння;

3) *ціха* спявалі;
4) *вялікія* магчымасці;
5) *пакланяліся* дубу.

**3. Адзначце несвабодныя словазлучэнні:**
1) расці ўшчыльную;
2) кот наплакаў;
3) ехаць наперарэз;
4) падаць духам;
5) абое рабое.

**4. Адзначце складаныя словазлучэнні:**
1) мастацкі кіраўнік тэатра;
2) працаваць як мокрае гарыць;
3) знаёмая з дзяцінства вуліца;
4) высіцца Курган Славы;
5) плывуць каля сонца.

**5. Адзначце словазлучэнні з азначальнымі адносінамі паміж словамі:**
1) працаваць якасна;
2) смуга сонца;
3) купіць падарунак;
4) бязвоблачнае неба;
5) мядзведжы след.

**6. Адзначце іменныя словазлучэнні:**
1) зжатае жыта;
2) бег не спыняючыся;
3) нешта незнаёмае;
4) па-свойму прыгожы;
5) далёка ад вёскі.

**7.Адзначце прыслоўныя словазлучэнні:**
1) зацвітае на ўзлессі;
2) меданосны чабор;
3) ляцець высока;
4) разам з дзецьмі;
5) позна вечарам.

**8. Адзначце словазлучэнні, у якіх сувязь паміж словамі – кіраванне:**
1) піць расу;
2) удар грому;
3) мутна-жоўтая вада;
4) ляцелі на рэчку;
5) глядзеў услед.

**9. Адзначце словазлучэнні, у якіх сувязь паміж словамі – прымыканне:**
1) сонечны бляск;
2) змянілася ўвачавідкі;
3) ішлі напрасткі;
4) песні птушак;
5) усыпаны кветкамі.

**10. Адзначце словазлучэнні з граматычнымі памылкамі:** 1) сумую па маме; 2) забыцца на ўсё; 3) пісаць па адрасе; 4) не спаць па начам; 5) жаніцца на аднакурсніцы.

# Літаратура

1. Калечыц, А., Цясевіч, А., Пекач, А. Сінтаксіс беларускай мовы. Урок 1. Словазлучэнне (заданні, тэсты) // Роднае слова – 2009. – №№2–3.

2. Цыбульская, С.І. Школьны курс беларускай мовы ў табліцах і тэстах. (Падрыхтоўка да цэнтралізаванага тэсціравання і экзамену). Частка II / С.І. Цыбульская.– Мінск: “Сэр-Вит”, 2008.

## Адказы

| Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|
| | |

| | |
|---|---|
| **1.** 1,3,5;<br>**2.** 2,3;<br>**3.** 3,4,5;<br>**4.** 2,4,5;<br>**5.** 2,3,4;<br>**6.** 1,3,5;<br>**7.** 3,5;<br>**8.** 2,3,4;<br>**9.** 1,3;4.5;<br>**10.**1,3,4. | 1. 1,2,4;<br>2. 2.5;<br>3. 2,4,5;<br>4. 1,3;<br>5. 2,4,5;<br>6. 1,3,4;<br>7. 4,5;<br>8. 1,2,4;<br>9. 2,3;<br>10.3,4.5. |

**Рэкамендацыі па правядзенні ўрока ў 10-ым класе па тэме “Словазлучэнне”:**

1. Абавязкова прапанаваць вучням тэарэтычныя звесткі па тэме ў форме памятак, каб дапоўніць, сістэматызаваць веды. Памяткі павінны быць у кожнага вучня ў канспекце.
2. Лепш прапанаваць выкладанне дадзенай тэмы, напрыклад, па тэхналогіі праблемнага навучання, дзе выкарыстоўваюцца не толькі традыцыйныя метады навучання (тлумачальна-ілюстрацыйны, рэпрадукцыйны), а перавага аддаецца **часткова-пошукаваму** – пастаноўка праблемы, складанне і прад’яўленне заданняў, планаванне этапаў іх выканання; і **даследчаму** – складанне і прад’яўленне праблемных задач для пошуку рашэння. Сутнасць тэхналогіі праблемнага навучання заключаецца не толькі ў стварэнні праблемнай сітуацыі, пастаноўцы праблемнага пытання, але і ў стварэнні разгорнутага дыялогу паміж настаўнікам і вучнямі па дадзенай тэме, праблеме. На праблемным уроку дзеці больш думаюць, разважаюць, аналізуюць, развіваюць творчыя здольнасці, праяўляюць ініцыятыву.
3. Тып урока – камбінаваны або прэзентацыя ведаў.
4. Для развіцця пазнавальнай актыўнасці вучняў, зацікаўленасці пэўным матэрыялам, працэсам навучання трэба прапанаваць вучням розныя формы дзейнасці на ўроку – вусную і пісьмовую, індывідуальную, франтальную і інш, выкарыстоўваць розныя віды практыкаванняў.
5. Адпрацоўваць навыкі работы і правяраць узровень засваення тэмы – праз тэставыя заданні (абавязкова арыентаваць вучняў на пэўныя выданні трэніровачных тэстаў).